Мы—насьледнікі Парыскіх барыкад

Ад Парыскай комуны, праз Чырвоны Кастрычнік—да сусьветнай пролетарскай рэволюцыі

60 год таму назад на парыскіх барыкадах гучэў лёзунг: „Няхай жыве комуна!“ Дзень 18 сакавіка 1871 году быў першым у 72 дзён Парыскай комуны.

18 сакавіка 1871—гэта першая у гісторыі спроба пролетарскай рэволюцыі. Іменна таму для нас—насьледнікаў комуны—урокі геройчнай барацьбы комунараў асабліва актуальныя. Маркс і Ленін падалі вынікі, гістарычныя вынікі 72 дзён Парыскай комуны.

„Рознастайнасьць тлумачэньняў, якія выклікала комуна, — пісаў Маркс, —рознастайнасьць інтарэсаў, якія ў ёй знайшлі свой выраз, даказвае, што яна была ў вышэйшай меры гнуткай палітычнай формай тым часам, як ўсе ранейшыя формы ураду былі па сутнасьці сваёй прыгнятальнымі. Яе сапраўднай таямніцай было вось што: яна была па сутнасьці, урадам рабочае клясы, вынікам барацьбы клясы, якая вытварае супроць клясы, якая прысвойвае. Яна была адкрытай, нарэшце, палітычнай формай, пры якой магло адбывацца экономічнае вызваленьне працы“.

Іменна Карл Маркс папярэдзіў парыскі пролетарыят ад несваечасовых і непадрыхтаваных спроб захапіць буржуазную ўладу. Але калі паўстаньне стала фактам, тады Маркс натхнёна вітаў геройчае выступленьне комунараў.

„Комуна,—пісаў Ленін,—першая спроба пролетарскай рэволюцыі разьбіць буржуазную дзяржаўную машыну і адкрытая, нарэшце, палітычная форма, якой можна замяніць разьбітую... Расійскія рэволюцыі 1905 і 1917 г. г., у іншых абставінах, пры іншых ўмовах, працягваюць справу комуны і пацьвярджаюць геніяльны гістарычны аналіз Маркса“.

Ужо пры комуне выявілася здольнасьць пролетарыяту ў барацьбе супроць старога парадку, здольнасьці выявіць яго. Але вялікае гістарычнае значэньне 72 дзён комуны перш за ўсё ў тым, што яна давядзены, няхай сабе на ў першай выражанай форме, і творчыя здольнасьці пролетарыяту, здольнасьці замяніць стары парадак новым.

Комуна пульсавала на многа тыдняў. У крывавых майскіх днёх была патоплена харобрае выступленьне комунараў. Тагочасны парыскі пролетарыят, у сваёй большасьці рамесьніцкі, яшчэ ня быў сьпелы і падрыхтаваны ўзяць уладу ў свае рукі. Гэта асноўная прычына правалу комуны. Правал Парыскай комуны яшчэ быў форсаваны тым, што комуна дапусьціла цэлы рад памылак, якія былі рэзка раскрываваны Марксам і Леніным. Ізоляванасьць геройчнага пролетарыяту Парыжу, адсутнасьць неабходнай падтрымкі ў краіне, у арміі, вёсцы, адсутнасьць неабходнай рашучасьці ў зьнішчэньні клясавага ворага, адсутнасьць пролетарскай партыі, спрыяючыя міжнародныя абставіны для французскай буржуазіі,—гэта ўсё не магло ня быць рашаючым у правале комуны.

Тое, што не ўдалося парыжскім комунарам у 1871,—удалося расійскаму пролетарыяту і яго партыі ў Кастрычніку 1917. Іменна мы і зьяўляемся законнымі насьледнікамі Парыскай комуны.

Сьёньня Парыскай комуны няма. Але сёньня ёсьць Савецкая комуна на 9-й частцы зямное кулі, якая ўяўляе сабою пачатак Сусьветнай комуны.

Геройчна загінулі парыскія комунары. Але ідэя і энтузіязм комунараў жыве. За Пэр-ля-шэз (месца, дзе ляжаць комунары) пролетарыят яшчэ прад'явіць гістарычны рахунак насьледнікам Т'ера—французскай буржуазіі.

60 год таму назад комунары паказалі ўзоры як змагацца і як памерці. Сёньня жыве выпрабаваная комуністычная партыя, комуністычны інтэрнацыянал і гэтым самім перамога забясьпечана.

Ужо Парыжская комуна давяла, што калі гутарка ідзе аб барацьбе супроць пролетарыяту і рэволюцыі,—тады ўся контррэволюцыя аб'ядноўваецца ў адзіны фронт. „Нацыянальныя“ інтарэсы адцясьняюцца соцыяльнымі. Вось Прусія ў 1870 годзе, у тагочаснай вайне, разбурыла Францыю. Але, калі трэ' было пазбавіцца ад комуны, пруская буржуазія дружна працягнула сваю руку французскай буржуазіі. Прускі генэрал Мак-Магон выявіў сябе ў барацьбе супроць комуны, ня менш, чым французскі генэрал Галіфэ.


Сёньня, калі будуе соцыялізм Савецкая комуна,—імпэрыялістыя таксама ўтвараюць адзіны фронт інтэрвэнцыі, пачынаючы з Брыяна, Рабушынскага і канчаючы Каўцкім, Данам.

Многа бурнай вады ўцякло за тыя 60 год, якія аддзяляюць нас ад Парыжскай комуны. Урокі комуны і клясавай барацьбы гэтых гадоў не прапалі дарма. Шлях барацьбы пролетарыяту сёньня дакладна і яскрава формулюецца бальшавіцкай партыяй.

Сёньня, калі мы пасьпяхова выконваем грандыёзны пяцігадовы плян соцыялістычнага будаўніцтва, калі мы ўжо ўступілі ў пэрыод соцыялізму, калі мы ў бягучым годзе дабудуем фундамант соцыялістычнай экономікі ў нашай краіне; сёньня, ў пэрыод рукіх і паўднёва-ўральскіх баёў, калі капіталізм разбураецца ад сваіх супярэчнасьцяй, калі „стабілізацыя“ распадаецца, як картачны домік, калі экономічны крызіс у шэрагу краін ужо выклікае палітычны крызіс,—мы можам упэўнена сьцьвярджаць:

Сусьветны пролетарыят крочыць ад Парыжскай комуны—праз Кастрычнік—да Сусьветнай Комуны!

Пролетарыят не забудзе вопыту Парыскай комуны



Новым Мак-Магонам ня ўдасца патапіць у крыві краіну пролетарскай дыктатуры.

На здымку: Портрэт маршала Мак-Магона, камандуючага Рэйнскай арміяй, з якою ён прыбыў у Парыж, каб задушыць паўстаньне комунараў.

ПРОЛЕТАРЫ УСІХ КРАЁЎ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА

№ 63 (1332) | АЎТОРАК, 17-га сакавіка 1931 г.

Да ўсіх членаў МОПР'у, да ўсіх працоўных БССР

(З адозвы Цэнтральнага Камітэту МОПР'у БССР)

Дарагія таварышы.

60 год прайшло з таго дня, як рэволюцыйныя рабочыя Парыжу, выгнаўшы буржуазію, узялі ўладу ў свае рукі і агаласілі комуну. Два месяцы і 10 дзён трымаліся комунары, змагаючыся з белагвардзейскімі войскамі. У моры крыві была патоплена Парыская комуна. 30.000 забітых рэволюцыйных рабочых, 45.000 параненых і пакалечаных—вось крывавы балянс Парыскай комуны.

Праз 46 год пасьля агалашэньня комуны 1871 году, расійскі пролетарыят, пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі, ажыцьцёвіў ідэі парыскіх комунараў.

Да 60-й гадавіны Парыскай комуны савецкая ўлада, побач з СССР існуе ў шматлікіх провінцыях Кітаю, з 60.000.000 насельніцтвам. Геройчныя кітайскія чырвоныя арміі аказваюць руйнуючы адпор генэральскім войскам. Мільёны працоўных сялян і сялянак дапамагаюць чырвоным часткам партызанскі рух шырыцца ў тыле ў контррэволюцыі. Гіганцкімі крокамі набліжаецца вызваленьне 400-мільённага Кітаю.

Працоўныя Савецкага саюзу разгортваюць зараз пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі наступленьне па ўсім фронце соцыялістычнага будаўніцтва, ажыцьцяўляючы заданьне 3-га рашаючага году пяцігодкі і будуюць фундамант соцыялістычнай экономікі.

Ва ўсім капіталістычным сьвеце аб вастраецца і паглыбляецца з катастрафічнай сілай нячуваны крызіс капіталізму, які руйнуе падставы прыгнечаньня і эксплёатацыі. Усё вышэй нарастае рэволюцыйны ўздым у капіталістычных краінах, колёніях і паўколёніях. 35.000.000 беспрацоўных, сумесна з працуючым пролетарыятам, аказваюць баявое супраціўленьне капіталістым. Усё шырэй і шырэй разгортваюцца вялізарныя стачачныя бойкі, якія прымаюць палітычны характар і выклікаюць упартыя сутычкі з паліцыяй, жандармэрыяй і фашысцкімі бандамі.

Імпэрыялістыя падрыхтоўваюць новую інтэрвэнцыю супроць Савецкага саюзу—бацькаўшчыны ўсіх рабочых.

Працэс контррэволюцыйнай „Прампартыі“, меншавікоў-інтэрвэнтаў, інтэлігенцкая контррэволюцыйная група беларускіх нацдэмаў выкрылі пляны інтэрвэнтаў і шкоднікаў.

Міжнародны пролетарыят, для якога Савецкі саюз і яго соцыялістычнае будаўніцтва зьяўляецца маяком у штодзенных клясавых бойках, пільна сочыць за падрыхтоўкай інтэрвэнтаў. Міжнародны пролетарыят адзначае 60-годзьдзе Парыскай комуны далейшай мобілізацыяй усіх сваіх сіл на абарону СССР.

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР заклікае ўсіх працоўных, усіх членаў МОПР'у ў дзень 60-й гадавіны Парыскай комуны помніць аб сваім абавязку перад рэволюцыйнымі рабочымі, якія змагаюцца з капіталізмам у краінах капіталу, колёніях і паўколёніях, і якія грудзьмі абараняюць Савецкі саюз ад інтэрвэнцкіх плянаў імпэрыялістых.

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР заклікае ўсе МОПР'аўскія організацыі ў дзень 18 сакавіка разгарнуць масавую вярбоўку рабочых і работніц, колгасьнікаў і колгасьніц, працоўных сялян і сялянак ў рады МОПР'у.

У дзень 60-й гадавіны Парыскай комуны ЦК МОПР'у БССР заклікае ўсіх працоўных, усіх МОПР'аўцаў БССР узьняць свой голас протэсту супроць масавага зьнішчэньня фашыстымі і соцыял-фашыстымі лепшых жывых сіл рэволюцыі, супроць зьверскага катаваньня рэволюцыянэраў у фашысцкіх турмах Польшчы, Заходняй Беларусі, Заходняй Украіны, супроць провокацыйнага арышту т. Тарашкевіча, супроць белага тэрору і фашызму, які бушуе ў краінах капіталу.

У дзень 60-й гадавіны Парыскай комуны ЦК МОПР'у БССР, у асобе 300000 організацыі МОПР'у Савецкай Беларусі, шле палкае пролетарскае прывітаньне ўсім палітзьняволеным, якія пакутуюць у турмах буржуазных краін, усім рэволюцыйным рабочым і сялянам Захаду і Ўсходу, якія змагаюцца з капіталізмам і фашызмам за дыктатуру пролетарыяту, за сусьветную комуну.

Няхай жыве рэволюцыйнае змаганьне міжнароднага пролетарыяту за сусьветную комуну!

Цэнтральны Камітэт МОПР'у БССР

Голад у Амэрыцы



На здымку: Сям'я галадаючых.

25 мільёнаў чалавек у ПАЗШ знаходзяцца ў жабрацкім стане

ВАШЫНГТОН, 12. У Вашынгтоне адчынілася конфэрэнцыя так званых прогрэсыўных палітычных дзеячоў, пэдагогаў, вучоных, прадстаўнікоў рэформісцкай амэрыканскай фэдэрацыі працы і г. д., на чале з сэнатарамі Кордысам, Бора і Ляфолетам. У конфэрэнцыі ўдзельнічае больш 200 чалавек.

Прамоўцы крытыкавалі мытніцкую і сельска-гаспадарчую палітыку ўраду. Удзельнікі конфэрэнцыі ўнікалі закранаць замежна-палітычныя пытаньні. Аднак, профэсар Бірд (гісторык) адзначыў, што большасьць „прогрэсыўных дзеячоў—прыхільнікі прызнаньня Савецкага саюзу.

Сэнатар Ляфолет, які выступіў з прамовай на конфэрэнцыі, заявіў, што прынамсі 25 мільёнаў чалавек у Злучаных Штатах знаходзяцца ў надзвычайна ўбогім стане з прычыны беспрацоўя і засухі. Камітэт па пытаньню аб беспрацоўі, на чале якога стаіць Ляфолет, прадсказвае ў бліжэйшым будучым далейшы рост беспрацоўя ў Злучаных Штатах.

Пролетарыят завяршыць справу герояў Парыскай комуны



На здымку: Портрэт вэтэрана Парыскай комуны—тав. Ле-Жэнь.

Аб Парыскай Камуне

Тыя дні гарматамі стагналі,
Тыя дні
пляваліся крывёй.
Бунтавалі шэрыя кварталы
і сьвісталі кулі
над зямлёй

Бушавалі, румзалі абшары.
І палалі людзі ў баёх,—
То былі гэроі—комунары
нячуваных
і бунтоўных дзён!..

Вораг люты
разбурыў надзеі.
Т'ер крывавы
выкінуў загад:
— „Разграміць комуну—
тых зладзеяў!
— Нішчыць,
вешаць,
рэзаць і страляць!“

Наляталі зграі генэралаў.
Гэта быў страшэнны,
жорсткі бой.
Сьцены турмаў белага Вэрсалю
Панабраклі сьвежаю крывёй...

Тыя дні напоўніліся сьмерцю.
Доўга будзе памятацца Т'ер!
Тыя дні
жывуць у буйным сэрцы
змагароў
Саюзу ССР!

Верым мы,
што золак не загасьне!
Разгарыцца полымны пажар,
Над зямлёй працоўнага
вэрсальца
заіскрыцца
наш Чырвоны Сьцяг!

Агняцьвет

Т'ер—кат Парыскай Комуны



На здымку: Т'ер, галава вэрсальскага ўраду ў час Парыскай комуны, які распарадзіўся зьнішчыць усіх герояў комунараў.

АБ СТАНОВІШЧЫ ВАЙСКОВАГА ВЫХАВАНЬНЯ І ЗАДАЧАХ КОМСАМОЛУ

(З дакладу т. Гузікава на II пленуме ЦК ЛКСМБ)

Задачы вайсковай работы комсамолу вынікае з тых міжнародных абставін, у якіх мы знаходзімся. XVI партзьезд, аналізуючы міжнароднае становішча, адзначыў, што надыходзіць канец перадышцы, што вайсковая пагроза з кожным днём набліжаецца. Гэта яскрава падцьвердзілі процэсы „промпартыі“, саюзнага бюро РСДРП меншавікоў. Адсюль задача перад намі—злучыць усю сваю работу з вайсковай падрыхтоўкай. Неабодна нашу работу пабудаваць так, каб мы маглі ў любы час перабудаваць свае шэрагі ў напрамку абароны нашай краіны, у напрамку выступленьня са зброяй ў руках на абарону Кастрычніка. Гэта патрабуецца ад усёй нашай рэспублікі і ўсяго комсамолу БССР. Гэтая задача яшчэ больш падкрэсьліваецца нашай прымежнасьцю з капіталістычным ладам. X зьезд ленінскага комсамолу БССР, IX усесаюзны зьезд прызналі слабым становішча вайсковай работы намецілі шэраг практычных мерапрыемстваў. X зьезд ЛКСМБ у рэзолюцыі, зьвярнуў асаблівую ўвагу на прамысловыя цэнтры. Работу па ваенізацыі ўзьняць на належную вышыню. Што мы маем у прамысловых раёнах? У гэтых раёнах мы маем усе неабходныя сродкі для таго, каб весьці работу па ваенізацыі. Калі ўзяць Менск, дык мы маем формальнае абгаварэньне гэтага пытаньня на бюро, на пленуме, на нарадзе конкрэтныя задачы пастаўленыя перад намі ня выконваюцца. Мы павінны ахапіць самыя шырокія колы беспартыйнай моладзі па ваенізацыі. Патрэбна ліквідаваць правы опортунізм, недаацэнку вайсковай небясьпекі што перашкаджае праводзіць вайсковую работу.

Нам патрэбна разгарнуць масава-політычную растлумачальную работу сярод моладзі комсамольцаў, растлумачыць сутнасьць экономічнага крызісу ў буржуазных краінах, прычыны крызісу, з якога шукае буржуазія выхаду—у падрыхтоўцы да ўзброенага нападу на Савецкі Саюз.

Трэба ажывіць работу комсамолу ў Асо-Авіяхэме, якая знаходзіцца зараз у занядпадзе.

Неабходна падняць актыўнасьць мас моладзі, насельніцтва, ліквідаваць недахопы, стварыць паход за вайсковую вучобу, за вайсковую работу. Дзеля таго, каб атрымаць становучыя вынікі, нам неабходна мець сродкі —програмы, зброю, патроны і неабходныя кадры.

Асноўнай задачай чыгуначных ячэек, ячэек Аўтадору зьяўляецца: аўладаць маторам, паравозам і перадаць свае веды шырокім колам; браць шэфства над колектывам, над ячэйкай дзеля аўладаньня гэтымі сродкамі барацьбы.

У нас не хапае організацыйных здольнасьцяй, яны ёсьць, але мы ня можам як-то разварушыцца. У нас няма організацыйнага замацаваньня, плянавасьць у гэтай справе —адна з баявых задач ва ўсёй нашай вайсковай рабоце.

Трэба скарыстаць вучэбныя пункты для ўключэньня туды комсамольцаў, дзе і праводзіць вайсковыя занятк і. На вёсцы асноўнай формай працы павінны зьяўляцца гурткі Асо-Авіяхэму. Вайсковыя школы нам патрэбна ўкомплектоўваць комсамольцамі. Мы павінны рыхтаваць камандзіраў-комсамольцаў і комуністых. На лініі Авіяфлёту нам трэба ўдзяліць належную увагу і пільнасьць. Нам трэба будзе зьвярнуць увагу на пабудову чырвонаармейскіх казармаў, клюбаў і г. д. У адносінах марскога флёту нам трэба зараз наладзіць пісьмовую сувязь, з лінкорам „Парыская Комуна“. Наша работа па сувязі з Чырвонай арміяй павінна быць палепшана. Мы павінны прыцягнуць каманды і радавы склад для дапамогі нам у ваенізацыі комсамолу. Соц. спаборніцтва, індывідуальнае і масавае за якасьць вучобы, за палепшаньне дысцыпліны павінна стаць штодзеннай работай армейскага комсамолу.



Трэба будзе ЦК КСМ зараз, улічваючы асаблівасьці раёнаў аказаць належную дапамогу, ўзмацніць кіраўніцтва.

Для таго, каб гэтыя задачы былі пасьпяхова прасунуты ў масы, трэба зьнізу даверху пасіліць кіраўніцтва. РК, ГК і ЦК павінны яшчэ больш мобілізаваць масу і мобілізуючы замацоўваць актыўнасьць. Толькі на падставе гэтага выкананьня пастаўленых задач у справе ваенізацыі комсамолам Беларусі будуць дасягнуты значныя посьпехі.

Чаму не ваенізуюцца ў Капылі?

З 5-ці комсамольскіх ячэек Капыля ні адна належным чынам не паставіла працу па ваенізацыі комсамольцаў, а таксама ўдзелу іх ў працы ячэек Асовіахэму. У мястэчку нават няма вайсковага гуртка. Яшчэ горш справа ў суседніх вёсках. Райсавет Асоавіахэму не дае ячэйкам належнага кіраўніцтва ў працы. Раённы камітэт комсамолу таксама ня лічыць, што праца ячэйкі Асовіахэму ёсьць праца і комсамольскай організацыі і ня прымае ў працы АСо- організацыі ніякога ўдзелу.

Колгасьнік

Цэнтральнаму камітэту чырвонаштандартнага ленінскага комсамолу Беларусі і баявой „Чырвонай Зьмене“

Штабу Ленінскага комсамолу і працоўнай моладзі Беларусі—ЦК ЛКСМБ і яго баявому органу і арганізатару працоўнай моладзі—„Чырвонай Зьмене“ ад раённай конфэрэнцыі рабочай, колгаснай і аднаасобнай бядняцка-серадняцкай моладзі—палкае бальшавіцкае прывітаньне.

Наша конфэрэнцыя сабралася ў час баявой падрыхтоўкі да другой бальшавіцкай вясны. У час, калі шырока разгортваецца праца па абвешчанаму X зьездам саветаў Беларусі месячніку па скончаньню загатовак і мобілізацыі сродкаў. Улічваючы вялікую політычную важнасьць гэтых баявых кампаній, якія павінны забясьпечыць поўнае выкананьне пляну 3-га, рашаючага году пяцігодкі, мы, дэлегаты, ад імя ўсёй рабочай, колгаснай і аднаасобнай бядняцка-серадняцкай моладзі Глускага раёну запэўніваем ЦК ЛКСМБ і баявую „Чырвонку“, што працоўная моладзь Глушчыны, пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі і комсамолу, баявымі бальшавіцкімі тэмпамі, поўнай мобілізацыяй сваёй энэргіі і энтузіязму, разгортваючы соц. спаборніцтва і ўдарніцтва, будзе змагацца за выкананьне і перавыкананьне задач 3-га, рашаючага году пяцігодкі, за замацаваньне існуючых колгасаў і організацыю новага масавага прыліву бядняцка-серадняцкіх мас у колгасы, за суцэльную колектывізацыю і за ліквідацыю на гэтай базе кулацтва як класы, вядучы рашучую барацьбу супроць правага ўхілу, як галоўнай небясьпекі на даным этапе, з „левымі“ загібамі і прымірэнствам да іх.

Другая бальшавіцкая вясна і месячнік па скончаньню загатовак і мобілізацыі сродкаў намі будуць праведзены ўдарнымі бальшавіцкімі тэмпамі.

Працоўная моладзь раёну пад сьцягам ленінскай комуністычнай партыі будзе ісьці ўперад бальшавіцкімі крокамі да новых перамог соцыялізму.

Няхай жыве ленінская комуністычная партыя бальшавікоў!

Няхай жыве тав. Сталін, верны вучань Леніна і правадыр нашай партыі!

Няхай жыве чырвона-штандартны комсамол, верны памочнік бальшавіцкай партыі, кіраўнік і організатар працоўнай моладзі!

Правяраем рэалізацыю адозвы ЦК і СНК

РАЗЬБІЦЬ ОПОРТУНІСТЫЧНУЮ НЕДААЦЭНКУ КАНТРАКТАЦЫІ

Спасылаюцца адзін на аднаго

МЕНСК. Менскі прыгарадны сельсавет зусім бязьдзейнічае ў галіне рэалізацыі адозвы ЦК і СНК аб кантрактацыі яравых пасеваў. Адозва не прапрацавана. У колгасах і вёсках, масава-растлумачальная праца не вядзецца.

Плянам кантрактацыі прадугледжана ў гэтую пасеўкампанію законтрактаваць па сельсавеце 333,55 га яравых культур, з іх—135,55 гектару. На 11-III не законтрактавана ніводнага га.

Сельсавет не кіруе гэтай працай, спасылаючыся на Райкоопсаюз, а Райкоопсаюз таксама бязьдзейнічае.

Патрэбна прыняць самыя рашучыя захады, каб разгарнуць працу.

Брыгадзір „Ч. З.“—Г. Фрыд

Не пераключыліся на ўдарныя тэмпы

ЗАСЛАЎЕ.—З прычыны бязьдзейнасьці кіраўніцтва Райкоопсаюзу і безадказнасьці за выкананьне важнейшай дырэктывы партыі і ўраду, у раёне на 13—III не законтрактавана ніводнага га яравых культур. Пляны кантрактацыі не спушчаны ў вёскі, зусім адсутнічае масавая праца.

Комсамольская організацыя незадавальняюча ўдзельнічае ў разгортваньні працы па кантрактацыі. Райком комсамолу і ячэйкі не пераключыліся на ўдарныя тэмпы работы.

Касагурскі

Умелі паміраць...

Яны былі аднымі з першых... 42 мужчыны, 3 жанчыны і 4 дзяцей. Іх паставілі на калені каля дому № 6, па вуліцы Розье. Адна жанчына, не становячыся на калені, з дзіцем на руках крыкнула таварышом:

—Пакажэце ім, што вы ўмееце паміраць стоячы.

Яе растралялі. Імя яе невядома. Яна засталася бязыменнай, як той стары, якога растралялі на вуліцы Кровацье.

—Растрэльвайце яго ў сьметнік,—падаў каманду афіцэр—як сабаку.

Комунар пабялеў. Губы яго затрэсьліся і ён голасна загаварыў:

—Я геройчна змагаўся і маю права памерці не ў гнаі.

—Заткніся...

...29 мая здаўся Вэнсэнскі форт. Яго афіцэраў растралялі ў тую-ж ноч, і адзін з пакараных—Дэлёрм—сказаў вэрсальцу, які камандаваў растрэлам:

—Памацайце мой пульс, ці баюся я?..

Гэтыя людзі умелі паміраць... Іх растрэльвалі ўсюды... На сквэрах, на вуліцах, у турмах. У турме Ракет за ноч зарэзалі 1.900 чалавек, і па сточных канавах турмы ручаём лілася кроў.

У Люксэмбурскім садзе салдаты хадзілі па лужах крыві і сьцены былі аблеплены мазгамі...


А ў гэты час крывавы сабака Т'ер гаварыў аб нацыянальным сходзе:

—Мы—сумленныя людзі. Суд будзе адбывацца па звычайных законах і мы будзем кіравацца толькі законамі.

...Судзілі афіцэры з цыгаркамі ў зубах. Допыт працягваўся хвіліну...

—Вы мелі зброю? Пакажэце рукі.

Хто быў сьмелы і меў „палазро-



Расстрэл коммунараў

ны выгляд“, забівалі тут-жа, за дзьвярыма суда, астатніх кідалі ў турму. Вызваленых не было...

—Які гонар!—енчыць вялікасьвецкі хрук.—Наша армія адпомсьціла за свае няўдачы неацанімай перамогай.

О, так, перамогай... 70 тысяч забітых і закатаваных—вось трофэі гэтай перамогі.

...Нарэшце, Парыж спалохаўся. Смурод ад чалавечых цел перапоўніў паветра сквэраў, пляцоў і вуліц. Корэспондэнт Гетра (Англія) піша:

„Той, хто хоць адзін раз пабываў у хавальні чалавечага мяса, на сквэры, Сэн-Жак, не запамятае гэтага відовішча. З зямлі тырчэлі галовы, рукі, ногі. Трупы ляжалі проста на зямлі і з саду ішоў страшэнны смурод. Ад гэтага смуроду людзі падалі на вуліцы... Каля Трокадэра гніло 1100 трупаў. У політэхнікуме яны ляжалі кучай у 00 мэтраў даўжынёю і ў 3 мэтры вышынёю... Міліярды мух круціліся над прасьмярдзелымі трупамі...

А Т'ер з гонарам тэлеграфаваў у Вэрсаль:

„Зямля ўсыпана іх трупамі, гэта відовішча хай паслужыць ворагам“. Але „нагляднае навучаньне“ трэба было скончыць,—трупы пагражалі чумой. Могілкі Парыжу— Пэр-Ляшэз і Монмартр-ня ўмясьцілі ўсіх нябожчыкаў, і іх прышлося паліць і адвозіць у правінцыю...

Крывавыя тыдні скончыліся. Наступілі крывавыя месяцы для тых, хто сядзеў у турмах.

Палоньнікаў адпраўлялі ў Вэрсаль. Каля цэркваў іх прымушалі маліцца. А натаўп лёкаяў, чынуш і простытутак крычаў:

„Сьмерць ім, сьмерць“. Але іх берагглі для Галіфэ. Ён сам абыходзіў іх рады ў Ля-Люэттэ. Вось што пісала „Дэйлі Нэве“.

„Гэнэрал Маркіз-дэ-Галіфэ сышоў з каня і пачаў агляд. Ён ішоў ціхім крокам, як наперадзе, выводзячы з радоў таго ці іншага палоннага.

—У вас элегантны твар—выходзьце з радоў,—гаварыў ён.

—У вас гадзіньнік вы, мабыць, чыноўнік комуны.

Якаясьці жанчына прасіла аб літасьці. Ён зусім спакойна адказаў

—Васпані, ня варта ламаць строіць комэдыю; я бываў ва ўсіх тэатрах Парыжу.

Яе растралялі.

У каго сівыя валасы—вон з радоў!

171 палоньнік вышлі ўперад.

—Вы больш вінаватыя—сказаў Галіфэ.

І іх трупы запоўнілі канавы мураванай цытадэлі.

А папы, гэтыя пошлыя ачысьціцелі забойстваў, служылі малебен.

Цяжка падлічыць у што абышлося чалавецтву гэтая бойня. Цяжка, вельмі цяжка.

Але мы памятаем.. Гісторыя зямлі яшчэ пішацца. І Парыж, горад першых барыкад, убачыць яшчэ многае.

Вэксэль Галіфэ і Т'ера некуль што не аплочан.

Ал. Адашчык

Парыская Комуна—прадвесьнік сусьветнай пролетарской рэволюцыі



Багатая гісторыя парыскіх комунараў. Байцы комуны варты званьня комунараў.

Буржуазія, задушыўшы комуну, жорстка расправілася з комунарамі. Кроў дзесяткаў тысяч гэроеў барбарскі растраляных рэакцыяй, лілася патокам.

На здымку: Гэнэрал Галіфэ, разбурыўшы комуну і зьверскі заліўшы вуліцы Парыжу крывёю.

КОМСАМОЛЬЦЫ МЕНСКУ І ЛЕЙПЦЫГУ УСТУПІЛІ У СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЕ СПАБОРНІЦТВА

ЗМАГАНЬНЕМ ЗА ПЯЦІГОДКУ Ў ЧАТЫРЫ ГАДЫ, РАЗГОРТВАНЬНЕМ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ РАБОТЫ РЭАЛІЗУЕМ СОЦЫЯЛІСТЫЧНЫ ДАГАВОР

Пачатак Менску і Віцебску ператворым у здабытак усяго ЛКСМБ

3-га лютага комсамол Нямеччыны пачаў квартал штурму супроць фашыцкай дыктатуры і катастрофы голаду. Агітпроп-група лейпцыйскіх комсамольцаў „Ды Штурмэр", нападставе штурмавога пляну паміж комсамолам Бэрліна і Лейпцыга, узяла на сябе шэраг конкрэтных абавязкаў і выклікала на соцыялістычнае спаборніцтва Менскі Гарком ЛКСМБ.

Сёньня мы друкуем адказ Менскага гаркому ЛКСМБ на выклік групы лейпцыгскіх комсамольцаў, які быў зьмешчан у нумары 38 „Чырвонай Зьмены", ад 11 лютага 31 году.

Соцыялістычнае спаборніцтва паміж комсамолам СССР і капіталістычных краін зьяўляецца лепшай формай інтэрнацыянальнай сувязі. У выкананьні рашэньняў X зьезду ЛКСМБ і IX УсеЛКСМ аб узмацненьні інтэрнацыянальнай работы ў комсамоле, мы павінны дамагчыся масавага разгортваньня соцыялістычнага спаборніцтва паміж комсамольскімі організацыямі СССР і капіталістычных краін.

Комсамол Беларусі, разгортваючы інтэрнацыянальную работу, павінен дабіцца палепшаньня сувязі з братэрскімі організацыямі комсамолу, асабліва з адшэфным атрадам—гэта комсамолам Польшчы і З. беларусі.

18 сакавіка сусьветны пролетарыят адзначае 60-годзьзе заснаваньня Парыскай Комуны і дзень МОПР'у Гэты дзень павінен быць выкарыстаны для зруху ў інтэрнацыянальнай рабоце ячэек. Менгарком ЛКСМБ абвясьціў дзень 18 сакавіка днём давядзеньня соцыялістычнага дагавору да колектываў і ячэек, Віцебскі гарком ЛКСМБ абвяшчае ў гэты дзень старт інтэрнацыянальнай эстафэты.

Гэтыя каштоўныя пачынаньні дзьвюх буйнейшых організацый Беларусі могуць даць вялізарнейшыя посьпехі ў інтэрнацыянальнай рабоце тады, калі будзе забясьпечана масавае іх правядзеньне, кіраўніцтва і кантроль над выкананьнем узятых на сябе абавязкаў, гэтыя пачынаньні павінны быць падхоплены ўсімі організацыямі комсамолу Беларусі. Неабходна вакол пытаньня інтэрнацыянальнай работы ўтварыць масавы рух у комсамольскіх ячэйках і сярод шырокіх колаў працоўнай моладзі. Усю работу па выкананьню пяцігодкі ў 4 гады, па ўзмацненьню СССР, як бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту, мы павінны праніваць нашымі інтэрнацыянальнымі задачамі.

Заўтра—старт інтэрнацыянальнай эстафэты Віцебскай організацыі ЛКСМБ

З мэтай яшчэ больш разгарнуць інтэрнацыянальна-выхаваўчую работу ў організацыі, гарком пастанаўляе:

* З 18-га сакавіка па 1-е красавіка па організанізацыі правесьці інтэрнацыянальчую эстафэту.
* У час правядзеньня эстафэты праверыць і ўзмацніць работу па інтэрнацыянальнаму выхаваньню.
* Комсамольскім ячэйкам у час правядзеньня эстафэты ўцягнуць усіх комсамольцаў у МОПР.
* Азнаёміць усіх комсамольцаў з міжнародным рабочым рухам, з работай КІМ'у (па матар'ялах IX зьезду), з програмай КІМ'у і з станов'шчам работы комсамолу Польшчы і Заходняй Беларусі.
* Праверыць становішча беларусізацыі ў організацыі з мэтай палепшыць гэтую работу.
* За час эстафэты дасягнуць яшчэ большага распаўсюджваньня ў організацыі і ў шэрагах рабочай моладзі беларускага друку і друку нац. меншасьцяй.
* Палепшыць пісьмовую сувязь з замежнымі ячэйкамі КСМ.
* Організаваць шэраг інтэрнацыянальных вечароў з дакладамі політэмігрантаў.
* Комсамольскім ячэйкам у дзень 18 сакавіка ўзяць на сябе абавязкі рапарту на інтэрнацыянальнай рабоце па пералічаных пытаньнях, што лічыць стартам эстафэты.
* Гарбюро ДКА распрацаваць конкрэтныя мерапрыемствы па ўключэньню ў эстафэту піонэрорганізацыі і школ.
* 1-га мая на прадпрыемствах правесьці агульна-гарадзкія сходы аб выніках інтэрнацыянальнай эстафэты.
* Перад гарпрофбюро і Гаркомам МОПР'у паставіць пытаньне аб уключэньні профсаюзных і МОПР'аўскіх організацый у інтэрнацыянальную эстафэту.



25-I-31 г. ў Гамбургу адбылася масавая дэманстрацыя супроць наступаючага фашызму.
На здымку: Агітпропгрупа на дэмонстрацыі.

МЫ—У БАРАЦЬБЕ ЗА ПЯЦІГОДКУ У 4 ГАДЫ, ВЫ—У БАРАЦЬБЕ ЗА ЗРЫНУЦЬЦЕ КАПІТАЛІЗМУ

Дагавор па соцспаборніцтву Менгаркому ЛКСМБ з агітпропгрупай Лейпцыгскага комсамолу „Ды штурмэр"

Пстодзёная праца комсамолу БССР усім ліку і Меншчыны, праходзіла і праходзіць пад кіраўніцтвам партыі у змаганьні за вырашэньне задач соцыялістычнага будаўніцтва, умацаваньне СССР, як бацькаўшчыны сусьветнага пролетарыяту.

Менская комсамолія паказала геройскія прыклады бальшавіцкай барацьбы за выкананьне плянаў першых двух гадоў пяцігодкі і ўзброены лепшымі прыкладамі і вопытам гэтай геройчнай працы, уступіла ў трэці рашаючы год пяцігодкі.

Змагаючыся за выкананьне пяцігодкі ў 4 гады, комсамол быў і будзе лепшым памочнікам партыі ў справе правядзеньня яе генеральнай лініі, у барацьбе супроць правага апортунізму, як галоўнай небясьпекі, „левых загібаў і прымірэнцкіх адносін да іх.

Узмацняючы соцыялістычную барацьбу сусьветнай рэвалюцыі, комсамол Менску, у ліку 12000 чалавек, з вялікім энтузіязмам сустрэў вашае прапанаваньне аб уступленьні з вамі ў соц. спаборніцтва.

Пункты нашага дагавору соц. спаборніцтва павінны ўзяць як асноўную ўвагу ўзгадаваньне палітычнай активнасьці мас рабочай і працоўнай моладзі на барацьбу за выкананьне гаспадарча-палітычных задач, супроць вайсковай інтэрвенцыі, за соцыялістычную рэвалюцыю на ўсім сьвеце.

Прымаючы ваш выклік, мы абавязваемся:

Ахапіць 100 проц. рабочай і колгаснай моладзі ўдарнымі брыгадамі па выкананьню якасных і колькасных паказчыкаў промфінпляну, пераключаючы працу гэтых ударных брыгад у галіну барацьбы за навуку і тэхніку, рацыяналізацыю і плянаваньне на прадпрыемствах, саўгасах, колгасах.

У выкананьне інтэрнацыянальных абавязкаў, абяцаем выканаць лёзунг партыі і комсамолу: „Ні аднаго комсамольца, маладога ўдарніка які-б не валодаў навукай тэхнікай соцыялістычнай прамысловасьці і сельскай гаспадаркі".

Надыходзячая другая бальшавіцкая вясна мобілізуе нас на сапраўдную дапамогу партыі ў справе колектывізацыі сельскай гаспадаркі раёну на 70 проц. Таму мы даем 10 комсамольскіх і 20 піонэрскіх рамонтных брыгад для рамонту сельска-гаспадарчага інвэнтара, організуем агітмасавы паход за колектывізацыю па прыгарадным раёне.

Выходзячы з пастановы Кастрычнікаўскага пленуму ЦК КП(б)Б, пастановы бюро ЦК КСМ аб мобілізацыі сродкаў, абавязваемся забясьпечыць выкананьне контрольных лічбаў, высоўваючы сустрэчны фінплян в 180 тыс. рублёў да 600 тыс. рублёў.

Абавязваемся мобілізаваць лепшых комсамольцаў-ударнікаў у шахты для дапамогі ў выкананьні пляну здабычы вугалю і ліквідацыі наяўных прарываў.

З мэтай узмацніць працу транспорту колектывы ЛКСМ прадпрыемстваў ствараюць буксірныя брыгады па перадачы вопыту соцыялістычнай організацыі працы на чыгунцы.

Аўладаньне рэвалюцыйнай марксыцка-ленінскай тэорыяй зьяўляецца неабходнай умовай за ўсім змаганьні за соцыялістычнае будаўніцтва. Таму, насустрач вашаму дагавору, уключаем пункт аб 100 % ахопе комсамольцаў і беспартыйнай моладзі вучобай, правядзем політбой па выніках X і IX зьездаў комсамолу, разгарнуўшы шырокае вывучэньне ленінізму. У сувязі з раскрыцьцём контррэволюцыйнай організацыі меншавікоў, разгорнем шырокую масавую работу сярод рабочых і ўсёй працоўнай моладзі па растлумачваньню сутнасьці працэсу, контррэволюцыйнай ролі меншавізму і II інтэрнацыяналу.


Удзел у соцыялістычным будаўніцтве спадарожваецца ростам політычнай актыўнасьці мас рабочай моладзі і цягаю яе ў КСМ. Таму Менская комсамолія бярэ на сябе абавязак выканаць пастановы X і IX зьездаў КСМ аб сто працантным уцягненьні рабочых, батракоў у КСМ.

Комсамолія Меншчыны, уступаючы ў соц. спаборніцтва з комсамоліяй Лейпцыгу, абавязваецца разгарнуць сталае вывучэньне становішча і чарговых задач КІМ'у і асабліва комсамолу Нямеччыны і Лейпцігу, а таксама шырокі збор сродкаў для загранічнага комсамолу.

Дзень 18 сакавіка абвяшчаем днём давядзеньня дагавору па сац. спаборніцтву да мас комсамольцаў рабочай і працоўнай моладзі праз організацыю на колектывах вечароў уступленьня ў соц. спаборніцтва з лейпцыгскім комсамолам.

Рот Фронт.

Менгарком ЛКСМБ



Політзьняволеныя ў баўгарскіх турмах падпадаюць самым жорсткім катаваньням і зьдзекам. Політ-зьняволены Іван Хрыстоў Тодараў хварэў у Сьлівеньскай турме. Ня гледзячы на тое, што ў яго тэмпэратура даходзіла да 40°, у больніцы з яго ня зьнялі кандалоў вагою 22 клг.

На здымку: тав. І. Х. Тодараў ляжыць у шпіталі ў кандалах

„Пролетарыі прысягнулі адпомсьціць за пролітую кроў"

Ліст „Чырвонай Зьмене" ад Лейпцыгскага юнкора

Колькасьць беспрацоўных у Лейпцыгу расьце з кожным днём і ў бліжэйшай будучыні яна дасягне 100 тысяч (толькі зарэгістраных). Дзесяткі і сотні рабочых і работніц не знаходзяць выхаду з галечы і голаду і канчаюць самагубствам. Гэты шлях ня наш шлях. Наш шлях—шлях барацьбы пад кіраўніцтвам комуністычнае партыі супроць эксплёататараў.

Дэмонстрацыі беспрацоўных былі яшчэ перад 25 лютага „левым" соцыял-дэмократычным прэзыдэнтам лейпцыгскай паліцыі забаронены. ў дзень-жа 25 лютага ўся лейпцыгская паліцыя была ўзьнята на ногі.

Протэст і абурэньне лейпцыгскіх беспрацоўных дасягнулі вялізарных памераў.

У двух самых вялікіх памяшканьнях Лейпцыга 25 лютага комуністычная партыя і рэволюцыйная профопозыцыя правялі масавыя сходы. Тысячы рабочых прынялі ўдзел у гэтых сходах. З баявымі прамовамі выступіў дэпутат нямецкага рэйстагу, т. Рэдэль, і рэдактар саксонскай рабочай газэты, тав. Якобс, які і перадаў прывітаньне ад рабочых і працоўных саюзу Савецкага Саюзу.

Паліцыя была ў поўнай гатоўнасьці. Ня гледзячы на гэта, стварыліся дзьве дэмонстрацыі. Армія голаду дэманстравала на вуліцах Лейпцыга з выкрыкамі:

Раптам вялікія каманда паліцэйскіх кінулася на дэмонстрантаў і пачала і гумовымі палкамі зьверскі зьбіваць. Рабочыя не адступілі і абараняліся. Неспадзявана казакі Фляйснэра пусьцілі агонь па бяззбройных рабочых. На працягу некалькіх хвілін месца дэмонстрацыі ўяўляла сабою крывавую лазьню. 4 рабочых былі на месцы забіты, больш 10 цяжка параненых. Ня гледзячы на агонь рэвольвэраў і вінтовак паліцэйскіх, рабочыя і работніцы беглі на дапамогу сваім параненым таварышам. Газэта лейпцыгскіх соцыял-фашыстых, 24-II у сваім артыкуле „Нямецкая комуністычная партыя мае патрэбу ў трупах", вяла шалёную кампанію супроць компартыі і рэволюцыйнай профопозыцыі. Гэта выклікала асабліваe абурэньне беспрацоўных, і таму адна філія гэтай газэты была беспрацоўнымі цалкам разгромлена.

3-га сакавіка адбыліся пахаваньні ахвяр 25 сакавіка. Гэтыя пахаваньні былі ператвораны ў масавае баявое выступленьне. Лейпцыгскія пролетары прысягалі адпомсьціць за пралітую кроў шляхам рашучай барацьбы супроць нацызмам і соцыял-фашызму, за дыктатуру пролетарыяту.

Няхай жыве наша барацьба за савецкую Нямеччыну!

Няхай жыве КІМ і Комінтэрн!

З комрывітаньнем—Лейпцыгскі юнкор

АБ САВГАСНЫМ БУДАЎНІЦТВЕ

(Даклад Наркомзема СССР тав. Якаўлева Я.*)

Арганізаваць уборку

Другое пытаньне—гэта пытаньне аб уборцы. У гэтым годзе ўпяршыню ў вялікай гаспадарцы „Зернотрэста" прышлося праводзіць уборку, прычым у раёнах, дзе надзвычай малая колькасьць жывой рабочай сілы. Ня гледзячы на тое, што ў агульным і цэлым наша збожжавая гаспадарка справілася з задачамі ўборкі, разам з тым выявіўся рад буйных недахопаў, на барацьбу з якімі мы павінны ўзьняць усіх работнікаў саўгасаў. Якія тут галоўныя недахопы?

Асноўны недахоп той, што пры працы з комбайнам размеры прастояў былі надзвычай вялікія, страта збожжа была больш чым ненормальнай. Прастоі трактараў па радзе вывучаных „Зернотрестом" саўгасаў складалі пры ўборцы комбайнамі 45 проц. усяго выкарыстанага часу, у той час, як пры ворыве яны складаюць толькі 17 проц. У радзе саўгасаў рабочы час комбайнаў складаў толькі 7 гадзін у суткі.

Комбайны на працягу некалькіх год стануць асноўнай уборачнай машынай ня толькі ў саўгасах, але і ў колгасах. Для гэтага трэба падрыхтоўваць кадры неадкладна. На недахопах уборкі мінулага году трэба вучыцца неадкладна. Неадкладна. Гэта пытаньне аб комбайнах толькі частка агульнага пытаньня аб уборцы, бо пакуль што, вядома, асноўным комплектам машын будуць жняяркі, снапавязалкі і плюс сярэдняй магутнасьці малатарні. Тут пытаньні рацыяналізацыі работы, правільнага выкарыстоўваньня наяўнай рабочай сілы, сваячасовай падрыхтоўкі да ўборкі становяцца настолькі важнымі, што рыхтавацца да іх трэба ўжо зараз неадкладна. Неабходна аўладаць агротэхнікай.

Нарэшце трэцяе апошняе пытаньне ў гэтай сувязі—пытаньне агротэхнікі. Нашы саўгасы нарадзіліся ў вайне з верхавінкай аграномаў, агратэхнікаў у вайне з „вучонымі" ўсіх відаў, бо гэтыя „вучоныя" прадстаўлялі сабой, па сутнасьці гаворачы, частку шкодніцкіх кадраў, якія прабавалі сарваць справу саўгасаў. У той-жа час рэволюцыйнасьць барацьбы супроць земскай дробна-буржуазнай проста шкодніцкай аграноміі Кандрацьевых, Чаянавых. Даярэнка зусім не павінна перашкаджаць нам выкарыстоўваць усе дасягненьні агратэхнікі ў нашай гаспадарцы. Некаторыя нашы работнікі думаюць, што агротэхніка—гэта нешта накшталт буржуазных забабонаў. Інакш, як такімі адносінамі да агротэхнікі нельга вытлумачыць таго факту, што ў нас ёсьць нямала людзей, якія абавязкова хочуць пабудаваць усім аднолькавыя ў агротэхнічных адносінах гаспадаркі на тэрыторыі ўсяго СССР, у той час як розны клімат, розныя глебавыя ўмовы выклікаюць сваясаблівасьць у агротэхнічнай структуры гаспадаркі ад раёну да раёну і нават унутры раёну ад саўгасу да саўгасу.

Без таго, каб аўладаць агротэхнікай, мы не даб'ёмся поўнага выкарыстаньня машын, нават у тым выпадку, калі ў нас трактар будзе працаваць на баразьне ня менш 21 гадзіны.

Вось, таварышы, такавы асноўныя недахопы ў вялікай нашай савгаснай збожжавай справе і такавы мэтоды барацьбы з імі. Перад збожжасавгасамі нашы тэзісы ставяць новыя вялізарныя задачы. Усе нашы савгасы павінны даць у 1931 годзе 190.195 млн. пудоў таварнага збожжа, у 1932 г.—290 млн. пудоў і ў 1931 г.—каля 400 млн. пудоў збожжа.

Для таго, каб справіцца з гэтай задачай, трэба аўладаць тэхнікай для выкарыстаньня трактараў і прычэпных машын, у асаблівасьці па лініі ўборкі, а таксама трэба аўладаць агротэхнікай. Лёзунг аўладаньня тэхнікай, які т. Сталін высунуў перад работнікамі прамысловасьці, у адносінах да буйной сельскай гаспадаркі, зьяўляецца яшчэ больш сваячасовым, чым у адносінах да прамысловасьці.

Вось чаму, яшчэ раз паўтараю лёзунг—аўладаньне тэхнікай—зьяўляецца галоўным, рашаючым, у вялізарнай меры перакрываючым усё тое, што я гаварыў аб задачах лепшага выкарыстаньня машын у буйной сельскай гаспадарцы. Можна з упэўнасьцю сказаць, што такія кадры, як кадры „Зернотреста", якія далі ўзоры сапраўды геройчных адносін да працы ў мінулым годзе, змогуць ажыцьцявіць на справе гэты лёзунг.

У галіне жывёлагадоўчай гаспадаркі памылак недахопаў значна больш, чым у збожжавай галіне. Гэта вядома выклікаецца часткова тым, што як я вам ужо дакладваў, тэрмін разгортваньня жывёлагадоўчых саўгасаў былі нязначнымі. Апрача таго, трэба мець на ўвазе, што тут справа, бадай, больш складаная, чым у збожжавай галіне, таму што тут маем справу не з машынай, а з жывой істотай. Машына калі вы ей не дасьце апалу, прастаіць два дні, а сьвіня, якую вы два тры дні не пакорміце, можа нaконт гэтага мець сваю думку, (сьмех) з асобымі вынікамі для гаспадаркі.

Нарэшце, яшчэ адна заўвага ў галіне жывёлагадоўлі, яшчэ ў большай меры чым у збожжавай гаспадарцы, мы прымушаны быць наватарамі. Бо ўзораў буйной жывёлагадоўчай гаспадаркі, такой, якую мы разгортваем, у сьвеце яшчэ няма. Вось наша стандартная гаспадарка ў галіне жывёлагадоўлі: сярэдні размер гаспадаркі жывёлавода ад 5 да 30 тысяч шт. жывёлы, сярэдні размер савгасу Маслатрэсту—ад 3-х да 10 тыс. шт., Сьвіноводу—ад 800 да 1.500 матак, г. з. да 15 тыс., прыкладна, шт. сьвіней. Аўцаводу—ад 50 тыс. да 150 тыс. шт. Гэта сярэдні размер аднае гаспадаркі.

Тут вучыцца нам трэба самім у сябе, выпраўляючы сваю справу, выпраўляючы свае памылкі.

Вузлавое пытаньне—кадры

Якія-ж галоўныя недахопы, што тут выкрыты? Бадай самым галоўным, самым асноўным зьяўляецца недахоп, зьвязаны з пытаньнем аб кадрах. Сапраўдных жывёлагадоўчых кадраў у нас няма. Мы яшчэ не стварылі іх. Можна вядома задаволіцца тым, што ў нас на працягу апошняга паўгодзьдзя вялікая колькасьць людзей стала жывёлаводамі, так сказаць, на хаду. Да прыкладу магу прывесьці такую лічбу што праз спэцыяльныя курсы чабаноў даяроў і сьвінароў падрыхтавана за апошнія два месяцы 25.000 чал. Не малая колькасьць. У сувязі з організацыяй жывёлагадоўчых саўгасаў мінулай восеньню мы прыём у жывёлагадоўчыя тэхнікумы пашырылі з 2.000 чал. адразу да 18 з паловай тысяч чал.

Але гэта ўсё літаральна тоне ў моры таго, што нам патрэбна. Ня мала ёсьць раёнаў, дзе сьвінар—гэта так, сказаць, ня вельмі паважаны чалавек. Ёсьць нават такія раёны, у якіх на курсы дырэктароў сьвінаводаў нельга было знайсьці кандыдатаў, бо ніхто не хацеў пайсьці на такую быццам мала ганаровую ролю дырэктара сьвінаводчай гаспадаркі. А вось зараз мы сьвінару рэзка павышаем пэнсію за тое, што ён у нас накшталт майстра на заводзе, вузлавая асоба ў саўгасе. Прыдзецца, як відаць, і далей у гэтым кірунку пайсьці. Гавораць, што першыя вынікі ўжо ёсьць, некаторыя дэлегаты гэтага зьезду мне расказвалі, што на вёсцы ўжо бываюць і такія выпадкі, калі сьвінарам адбою няма ад нявест (сьмех).

Таму, паўтараю, пытаньне аб кадрах тут зьяўляецца самым галоўным, рашаючым, асноўным. Пакуль што кадры тут больш чым слабыя, прычым наўрад ці дапамагаюць справе. Тое, што ў некаторых раёнах некаторыя нашы работнікі гатовы самаўпэўненасьцю замяніць веданьне справы. Ісаеў, прадстаўнік Казакскага ўраду, на казакскім зьезьдзе расказваў аб тым, як нявопытныя людзі ў аўцаводчых саўгасах дапускаюць у адносінах да авечак памылкі такога роду, якіх-бы тутэйшы чалавек не дапусьціў-бы ведаючы звычкі, натуру і ўсе іншыя ўласьцівасьці мясцовай авечкі. А ў нас значная частка гэтых жывёлагадоўчых саўгасаў Аўцаводу, „Скотовода" знаходзіцца ў Казакстане і Сярэдняй Азіі. Тут раскінута палова ўсёй тэрыторыі „Скотовода".

Было-б няправільна думаць, што можна з якой небудзь іншай крыніцы, апрача мясцовага насельніцтва, апрача казакаў, стварыць асноўную частку патрэбных кадраў. Тое-ж самае адносіцца і да аўцаводчых саўгасаў у Сярэдня-Азіяцкіх рэспубліках, дзе, вядома, бяз узьбекаў каракуляводчага саўгасу ніяк нельга стварыць. Толькі выхаваньнем кадраў з гэтага асяродзішча можна нам забясьпечыць пастаноўку справы ў саўгасах. Вось як тут стаіць справа.

*) Пачатак глядзі ў № 62 ад 16 сакавіка. Даклад падаецца ў скарочаным выглядзе.

Аб стварэньні кармовай базы ў саўгасах

Другое пытаньне, да вырашэньня якога мы толькі прыступаем, пачынаючы з гэтага году—гэта стварэньне кармовай базы. Спачатку прывяду вам, таварышы, прыкладную колькасьць кармоў, якая патрэбна будзе саўгасам, калі вы зацьвердзіце прапанаваны намі плян разгортваньня саўгасаў. Грубых кармоў патрабуецца, прыкладна, 450 млн. пудоў у 1931 г. і 700 млн пудоў у 1932 г., 1 мільярд пуд. у 1933 г. і 1 мільярд—у 1933 г. сена і часткова саломы. Сакавітых кармоў (бульба, буракі, турнэпс і сілос) патрабуецца, прыкладна, 200 млн. пудоў у 1931 г. для саўгасаў, калі яны будуць разгорнуты ў тых размерах, якія мы намячаем у тэзісах. У 1932 годзе патрабуецца іх каля 600 мільёнаў пудоў і ў 1933 г., прыкладна, 900 млн. пудоў бульбы, буракоў, турнэпсу, сілосу.

Вось размер кармовых задач. Збожжасаўгасы павінны будуць сабраць больш 40 млн. пудоў у 1933 годзе, жывёлагадоўчыя савгасы павінны будуць у 1933 г. сабраць каля 1 мільярду грубых кармоў, каля 400 млн. пудоў сакавітых кармоў, каля 100 млн. пудоў концэнтраваных кармоў. Паўтараю, ня лічачы, прыкладна, 400 млн. пудоў концэнтраваных кармоў, якія павінны быць атрыманы з боку. Вы бачыце, што адна з цяжэйшых задач—пытаньні мэханізацыі ў гэтай галіне, галіне падрыхтоўкі кармоў і вытворства—гэта такія пытаньні, без вырашэньня якіх мы жывёлагадоўчай гаспадаркі не пабудуем. З гэтым зьвязана і пытаньне аб беражлівых адносінах да кармоў. На жаль, ня гледзячы на тое, што ў гэтым годзе ў жывёлагадоўчых саўгасах асабліва цяжка з кармамі, паколькі, як правіла, саўгасы організаваліся ў сярэдзіне лета.

Можна было-б прывесьці дзесяткі прыкладаў злачынных адносін да кармоў. Вядома, якіх работнікаў, якія злачынна адносяцца да кармоў, якія не разумеюць, што да кармоў трэба адгосіцца ня менш беражліва, чым да нафтаапалу, які выкарыстоўваецца на трактарах, мы павінны лічыць ня прыяцелямі, а ворагамі саўгасаў. Трэба спадзявацца, што такіх работнікаў будзе нямнога, іх ня так многа і зараз, іх не павінна быць у гэтым годзе зусім, паколькі ствараюцца паступова патрэбныя новыя кадры.



Колгасьнікі за вывучэньнем трактару

Аб палепшаньні пароды жывёлы

Трэцяя задача, на якой я спыніцца ня буду, бо ён спыніцца падрабязна ў сваіх дакладах старшыні жывёлагалоўных трэстаў,—гэта палепшаньне пароды жывёлы. Тут мы павінны дасягнуць вельмі многага, бо наша старая сялянская жывёла ў адносінах да ўдойнасьці, у адносінах хуткасьці нарастаньня вагі і інш. на многа горшая звычайнай замежнай. Фактам зьяўляецца тое, што амэрыканская мясная жывёла за паўтара-два гады дасягнула ў два разы большай вагі чым наша ва ўзросьце ад 4 да 5 год.

У гэтых адносінах перад намі стаіць задача мэтысацыі асноўнай часткі жывёлы, пастаўленай у дзяржаўным сэктары ўжо на працягу бліжэйшых год з тым, каб адначасова стварыць патрэбны заводзкі гурт, які можна было-б выкарыстаць для палепшаньня пароды колгаснага гурту.

Аб вадзе

Нарэшце, чацьвертае пытаньне—гэта пытаньне аб вадзе. Можа быць, хто-небудзь з вас зьдзівіцца таму, што на зьезьдзе саветаў прыходзіцца гаварыць аб такой старой рэчы, як вада для саўгасаў. Але тут прыходзіцца мець на ўвазе, што для абслугоўваньня мільёнаў, правільней сказаць, дзесяткаў мільёнаў жывёлы, сконцэнтраванай у буйнай гаспадарцы, не абыйсьціся простай сялянскай студняй. Калі „жураўлём" працаваць, прыдзецца сабраць для догляду гэтай жывёлы зусім недапушчальную з народна-гаспадарчага пункту погляду колькасьць рабочых. Тут патрэбны студні, якія мэханічна падавалі-б колькасьць вады, патрэбную для соцень шт. жывёлы. Ужо ў гэтым годзе мы павінны пабудаваць у жывёлагадоўчых саўгасах каля 24 тысяч студняў. Вось чаму пытаньне аб вывучэньні глебавых вод тэрыторыі саўгасаў, пытаньне аб помпах, рухавіках, у прыватнасьці аб паветраных рухавіках—гэта такія пытаньні, якія прыдзецца нам вырашаць неадкладна, тым больш, што вельмі вялікая колькасьць жывёлагадоўчых, асабліва аўцаводчых саўгасаў, знаходзіцца ў самых сухіх частках нашай краіны, у тым ліку ў тых раёнах Казакстану, дзе ніякая іншая гаспадарка, апрача, як экстэнсыўная жывёлагадоўчая, немагчыма.

Падыход да сельскагаспадарчага раёнаваньня

Паколькі на аснове дробнай сялянскай гаспадаркі ніякае сапраўднае раёнаваньне было немагчыма,—цана гэтых разважаньняў Чалінцавых, Макаравых наконт раёнаваньня СССР на аснове дробнай гаспадаркі адсюль відавочна! Толькі вопыт разгортваньня нашых саўгасаў дазваляе ўстанавіць больш-менш упэўнена некаторыя асноўныя рысы будучага сельска-гаспадарчага раёнаваньня. Галоўныя фабрыкі збожжа знаходзяцца на Паўночным Каўказе, стэпавай Украіне, Сібіры, Урале, Паўночным Казакстане, Заволжы і Далёка-Ўсходнім краі. Тут у наяўнасьці такая тэндэнцыя: як відаць, у далейшым рост збожжасаўгасаў у Казакстане, Заволжы затрымаецца пры адначасовым асабліва ўмоцненым разьвіцьці збожжасаўгасаў у Сібіры і Далёка-Усходнім краі. Мясная жывёла і авечкі знаходзяцца, галоўным чынам, у Казакстане (каля паловы цяперашняй плошчы саўгасаў „Скотовод") у Сібіры (каля 1/4 цяперашніх саўгасаў „Скотовода"), далей на Заволжы, Паўночным Каўказе, Сярэдняй Азіі (у Сярэдняй Азіі пераважна аўцаводства). Другі раён мясной жывёлагадоўлі—поймы рэк усіх раёнаў і спажываючая паласа, дзе будзе разьвівацца інтэнсыўная мясная жывёлагадоўля. Аўцаводчыя гаспадаркі знаходзяцца пераважна ў раёнах з колькасьцю асадкаў да 200 міліметраў на тэрыторыі сухіх стэпаў, а таксама ў прадгор'ях Каўказу, Уралу, Паўднёвай часткі Казакстану, дзе аўцаводчыя гаспадаркі зьяўляюцца адзінымі, што дазваляюць продукцыйна выкарыстоўваць пасьбішчы.

(Працяг будзе)

З спрэчак па дакладу тав. Якаўлева

Пасьля дакладу Наркомзема СССР тав. Якаўлева і садакладаў зернатрэсту і жывёлагадоўчых савгасных трэстаў, на зьезьдзе працягваліся спрэчкі па дакладах.

Тав. Ялухін (Зах. Сібір) гаворыць: у нас у краіне ўжо організавана 60 савгасаў. У бягучым годзе па пляну вызначана організаваць столькі-ж, у выніку савгасы у 1931 гаду будуць займаць плошчу 13 з паловай мільёнаў га. Практыка ўжо ўвачавідкі паказала вялізарнейшыя перавагі буйных савецкіх гаспадарак.

Тав. Полбіцын (Сярэдняя Волга). Вопыт організацыі буйных гаспадарак даў бліскучыя вынікі. Усе прароцтвы шкоднікаў і правых опортуністых аб нявыгаднасьці буйных гаспадарак з трэскам праваліся. У Сярэдня-Волскім краі ў бягучым годзе ў капітальнае савгаснае будаўніцтва ўкладваецца 60 мільёнаў руб., трэба правільна выкарыстаць гэтыя сродкі.

Тав. Гаркуша (Украіна) гаворыць, што заданьне па павілічэньню урад жайнасьці, атрыманае савгасамі, зьменшана. Дасягненьні савгасаў упэўніваюць сялян у перавазе колгасаў. Практыка дастаткова пераканаўча гаворыць за сябе. Правы опортунізм праваліўся з сваімі прароцтвамі, ён пахаваны на палёх савгасаў.

Тав. Адамовіч (Масква) расказаў аб разьвіцьці цукровай прамысловасьці і рабоце савгасаў Саюзцукру. Савгасы і колгасы сыстэмы Саюзцукер у 1930 г. па буракох далі звыш 60 проц. усяго вучастка. Акрамя таго, савгасы далі каля 4 мільёнаў цэнтнэраў таварнага хлеба. Таварная продукцыя савгасаў у мінулым годзе складала каля 100 мільёнаў руб.

Тав. Канавалава (Казакстан) і тав. Балакчын (Казанская аўтаномная вобласьць (указваюць на неабходнасьць стварэньня моцнай кармовай базы. Казацкія організацыі у гэтым годзе ўжо загадзя адвялі большую зямельную плошчу пад пасевы кармоў і насеньня. У Хакаскай вобласьці стварэньне кармавой базы тармозіцца з-за недахопу трактароў і прычэпных машын.

Адказны рэдактар—МІХ. ПЛАТАЎ

Друкарня імя тав. Сталіна

Галоўлітбел № 599